ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
20 ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 6 (1492)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## XXVII з'езду КПСС — дастойную сустрэчу!

Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
•ЎЧОРА • СЁННЯ • ЗАЎТРА•

### З 17 ПА 23 ЛЮТАГА

на механіка-матэматычным факультэце пройдзе тыдзень кубінасавецкай дружбы. У яго праграме: семінар актыву камсамольскіх арганізацый універсітэта і кубінскага зямляцтва, спаборніцтва па валейболу, сумесны культпаход у кінатэатр, удзел кубінскіх студэнтаў ва універсітэцкім вечары працоўнай славы. На заключным вечары будуць падведзены вынікі, кубінскія і савецкія студэнты пакажуць сваю мастацкую самадзейнасць.

А. ФАМЛЮК,
намеснік сакратара камітэта камсамола ММФ па інтэрвыхаванню.

### СУСТРЭЧА

з выпускнікамі, цяпер маладымі журналістамі, адбылася на іх родным факультэце. Яны расказалі пра тое, як прыйшлі да сваёй прафесіі, чаму аддалі ёй аддалі свае сілы і здольнасці, аб першых цяжкасцях і іх пераадоленні. Студэнты і выкладчыкі задавалі практыкам пытанні. Сустрэча перарасла ў сур'ёзную, дзелавую гутарку аб адказнасці журналістаў перад грамадствам, чытачом.

І. НЯРОШЧЫНА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

### НАРОДНЫ ТЭАТР-СТУДЫЯ

студэнтаў рыхтуецца наведаць падшэфны саўгас «Гарадок» Узд зенскага раёна з новым спектаклем «Юбілей» (пастаноўка Б. Уторава).

Т. РУДКОЎСКАЯ.

### КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ДЫСКАТЭКУ

універсітэта будзе працягвацца тыдзень з мэтай вызначэння лепшых дыска-праграм і вядучых. Свае праграмы прадэманструюць юрыдычны, гістарычны, фізічны, геаграфічны факультэты і факультэт журналістыкі. Пераможцы будуць аб'яўлены ў наступным нумары газеты.

Т. МАРГАРЫТАВА.

### ВЫСТАЎКУ-АГЛЯД

літаратуры па тэме «Песняры народнага подзвігу» арганізаваў аддзел навуковай і мастацкай літаратуры.

На выстаўцы прадстаўлена літаратура аб Радзіме, аб подзвігу савецкага народа, аб партызанскай барацьбе і мастацкія творы аб Вялікай Айчыннай вайне.

Кнігі, якія дэманструюцца, выдаюцца на дом.

З. ШАЛУПЕНКА,
загадчыца аддзела навуковай і мастацкай літаратуры.

**У гэтыя дні ўвесь савецкі народ рыхтуецца да дастойнай сустрэчы XXVII з'езда КПСС. З вялікім гонарам мы даведаліся, што напярэдадні адкрыцця з'езда за дасягненне высокіх вынікаў у сацыялістычным спаборніцтве 1985 года Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна ўзнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў.**

## ВЫШЫНЬ ЗАВАЯВАНЫХ НЕ ЗДАВАЦЬ!

ВА УНІВЕРСІТЭЦКАЙ актавай зале мнагалюдна. Тут выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты — прадстаўнікі шматтысячнага калектыву універсітэта.

Адкрывае канферэнцыю сакратар парткома універсітэта прафесар **М. І. Юрчук.** Ён прадастаўляе слова сакратару ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў **Ю. Г. Нікіфараву:**

— Мне вельмі прыемна літаральна напярэдадні адкрыцця XXVII з'езда КПСС павіншаваць вас з узнагародай — пераходным Чырвоным сцягам нашай галіны. Гэта заслуга ўсяго вашага вялікага калектыву. БДУ імя У. І. Леніна валодае магутным навуковым патэнцыялам. За гады XI пяцігодкі было падрыхтавана звыш 14 тысяч спецыялістаў. Далейшае развіццё атрымала ўкараненне новых форм арганізацыі вучэбнага працэсу, выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання. Пашырыліся сувязі універсітэта з вытворчымі аб'яднаннямі «Інтэграл», «Гранат». За апошні час было абаронена 32 доктарскія, 420 кандыдацкіх дысертацый. За XI пяцігодку выкананы аб'ём работ студэнтамі прыкладна на 1,5 мільёна рублёў. 72 студэнты былі саўтарамі вынаходніцтваў.

Мы спадзяёмся, што БДУ імя У. І. Леніна будзе працаваць яшчэ лепш — гэта патрабаванне часу. Удасканальваць якасную падрыхтоўку спецыялістаў, поўнасцю выкарыстоўваць навуковы патэнцыял ВНУ — вось галоўныя задачы, якія стаяць сёння перад універсітэтам.

А зараз дазвольце ўручыць пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў.

Пад апладысменты прысутных Ю. Г. Нікіфараў уручае пераходны Чырвоны сцяг.

Слова прадастаўляецца рэктару універсітэта, акадэміку АН БССР **Л. І. Кісялеўскаму:**

— Дарагія таварышы! Толькі што мы сталі сведкамі хвалюючай падзеі — нам уручылі пераходны Чырвоны сцяг за паспяховае выкананне сацыялістычных абавязацельстваў 1985 года і пяцігодкі ў цэлым. Гэта ўзнагарода стала высокай ацэнкай працы нашага калектыву. Пераходны Чырвоны сцяг — гэта вялікі гонар і вялікі абавязак. Ён мабілізуе нас працаваць яшчэ лепш.

Партыйныя дакументы мінулага года далі нам надзейны імпульс для работы. ЦК КПСС абазначыў новыя вяршыні, асабліва вялікая роля адводзіцца навуцы. Мы імкнёмся ўсе навуковыя распрацоўкі ўкараняць у практыку. Значна палепшылася якасць падрыхтоўкі спецыялістаў, павысілася кваліфікацыя выкладчыкаў. Але ўжо сёння мы павінны думаць аб тым, як будзем працаваць далей. Трэба рыхтаваць нашых выхаванцаў так, каб яны добра валодалі асновамі марксісцка-ленінскага вучэння, свае веды з поспехам маглі прымяніць на практыцы, былі людзьмі высокай культуры. Мы запэўніваем, што і ў будучым будзем працаваць творча і старанна, каб памножыць дасягнутыя вынікі.

На трыбуне — **В. А. Гайсёнак,** сакратар партыйнага бюро фізічнага факультэта, які стаў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва універсітэта:

— Наша канферэнцыя праходзіць пасля XXX з'езда Кампартыі Беларусі і напярэдадні XXVII з'езда КПСС. Хачу сказаць, што і наш калектыў уносіць уклад у выкананне пастаўленых партыяй задач.

За гады пяцігодкі намі падрыхтавана звыш 1000 спецыялістаў. Даследаванні вяліся па актуальнай тэматыцы. Пашыраліся сувязі з вытворчасцю. Сёння ў нас — свята. Але ёсць у нас яшчэ і шмат праблем.

Далей В. А. Гайсёнак спыніўся на пытаннях павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Расказаў аб шляхах вырашэння гэтай праблемы на фізічным факультэце.

Загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў **В. С. Сцёпін** у сваім выступленні адзначыў:

— Зараз у краіне ў самай ходкай лексіцы словы «інтэнсіфікацыя», «паскарэнне». Так, наша краіна развіваецца, мэтанакіравана і ўпэўнена ідзе да пабудовы камунізму. Сацыялістычнае спаборніцтва — гэта адзін са спосабаў уздыму актыўнасці і ініцыятывы мас. Праца была і застанецца галоўным крытэрыем чалавечай дзейнасці.

Так, праца — настойлівая, руплівая, самаадданая. Праца на карысць Радзімы, на памнажэнне яе здабыткаў — такой бачыць яе калектыў універсітэта. І ўзнагароджанне БДУ імя У. І. Леніна пераходным Чырвоным сцягам — гэта высокая ацэнка яго дасягненняў, якая абавязвае працаваць яшчэ больш, лепш, якасней.

**А. МАТУСЕВІЧ,**
**наш кар.**





*НА ЗДЫМКАХ: у час уручэння пераходнага Чырвонага сцяга; у прэзідыуме канферэнцыі.*

*Фота В. УЛАСАВА, А. БАШМАКОВА.*

МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

# МАЦНЕЙ, ДРУЖБА!

**Вярнулася з Гродна інтэрнацыянальная брыгада. У саставе яе было 25 удзельнікаў, прадстаўнікоў 15 краін свету, студэнтаў, якія вучацца ва універсітэце. Сустрэча з вучнямі сярэдняй школы г. Гродна і студэнтамі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта — гэта яшчэ адзін доказ дружбы паміж савецкай моладдзю і моладдзю іншых краін.**

...ШКОЛА № 3 г. Гродна носіць імя пагранічніка В. М. Усава, загінуўшага ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Школьнікі беражліва захоўваюць памяць аб сваім земляку. Яны стварылі музей баявой славы. Адсюль і пачалося знаёмства. Вучні паказвалі школу, расказвалі, чым яны займаюцца: музычныя ўрокі па класу фартэпіяна, баяна, домры, працоўнае навучанне на вытворчым аб'яднанні «Сінтвалакно». А потым гасцей запрасілі ў клас. Студэнтам прыйшлося адказваць на шматлікія пытанні дзяцей. І гэта было не так проста.

Потым ужо дзяўчаты з Чэхаславакіі Сільвія і Міраслава, прызналіся, што з цяжкасцю знайшлі выйсце са становішча, калі ім пачалі задаваць пытанні з гісторыі сталіцы ЧССР — Прагі. А Гіту Шрэстху з Непала, напрыклад, папрасілі што-небудзь спець на роднай мове.

Вучні з чацвёртага класа запрасілі да сябе палесцінца Набіля.

«Што я буду ім гаварыць, такім маленькім?» — з трывогай думаў Набіль, спяшаючыся за вёрткімі чацвертакласнікамі. Набіль адчуваў сябе не вельмі ўпэўнена. Але хутка адносіны наладзіліся. Дзяцей цікавіла амаль усё. Пачынаючы з таго, якія птушкі і звяры водзяцца на Блізкім Усходзе, і заканчваючы тым, як гучыць слова «мір» на яго роднай мове. Набіль адказаў:

— Слова «мір» гучыць на усіх мовах прыгожа.— І дадаў:— Я не бачыў міру да таго часу, пакуль не прыехаў у СССР. Не ўсе людзі на нашай планеце могуць жыць спакойна і шчасліва.

Дзеці пачулі, як іх равеснікі змагаюцца за свабоду і мір.

...Сустрэча працягвалася ў канцэртнай зале. Члены інтэрнацыянальнай брыгады працягвалі сваю размову са школьнікамі з дапамогаю песні і танца. Ужо ў канцы, калі ў піянерскім пакоі засталіся толькі госці і настаўнікі, на пытанне дырэктара школы У. У. Вяршэнкі, ці спадабалася замежным гасцям, Дзіала Усман з Гвінеі адказаў:

— Мы зразумелі, якое вялікае значэнне надаюць у савецкай школе інтэрнацыянальнаму выхаванню падрастаючага пакалення. Дзеці задавалі такія складаныя пытанні, былі настолькі цікаўнымі, што міжволі мы пранікліся да іх вялікай павагай. Прыходзіць упэўненасць, што мір на планеце магчыма захаваць.

Вечарам студэнтаў чакалі ва універсітэце.

Сярод членаў агітбрыгады былі і ўдзельнікі XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве: Ахмед і Сейль з Амана. Іх слухалі з асаблівай увагай. Не меншую цікавасць выклікалі выступленні чэшскіх і нямецкіх студэнтаў.

— Мір, дружба, салідарнасць! — гучала на ўсю залу.

Гэта сустрэча застанецца ў памяці надоўга. Удзельнікі яе яшчэ раз адчулі вялікую сілу яднання, братэрства, дружбы.

**Н. МАРЦІНКЕВІЧ.**

# Плён садружнасці

**Трыццаць шэсць гадоў таму назад у палітычным жыцці В'етнама і Савецкага Саюза адбылася важная гістарычная падзея: быў падпісаны дагавор аб устанаўленні дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі. З гадамі гэтыя адносіны мацнелі і развіваліся. У кожным поспеху в'етнамскага народа відаць велізарная роля брацкай дапамогі Савецкага Саюза. Адзін з важнейшых яе бакоў — падрыхтоўка кадраў для В'етнама.**

**У мінулыя гады ў СССР навучаліся дзесяткі тысяч кваліфікаваных рабочых, больш як 20 000 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у тым ліку больш як 3000 кандыдатаў і 70 доктараў навук.**

**За перыяд з 1962 па 1985 гады 989 пасланцоў в'етнамскага народа скончылі падрыхтоўчы факультэт БДУ, дзе яны атрымалі добрыя веды па рускай мове, што дапамагло ім прадоўжыць вучобу ў іншых ВНУ СССР, 332 в'етнамскія студэнты сталі дыпломнікамі БДУ, а 49 чалавек атрымалі вучоную ступень кандыдата навук. Акрамя таго, многія в'етнамцы праходзілі навуковыя і педагагічныя стажыроўкі ва універсітэце. За вялікія заслугі ў справе падрыхтоўкі навуковых кадраў для В'етнама БДУ у 1978 годзе ўзнагароджан ордэнам Дружбы нашай рэспублікі.**

**Выпускнікі Белдзяржуніверсітэта выдатна працуюць на розных пасадах у народнай гаспадарцы В'етнама. Сярод іх можна адзначыць, напрыклад, Чан Дык Вана, цяпер доктара фізіка-матэматычных навук, члена ЦК СКМ Хошыміна і намесніка старшыні савета маладых вучоных В'етнама. Ву Кім Туан пасля заканчэння БДУ паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю і цяпер працуе над доктарскай.**

**НГУЕН В'ЕН ЦЬЫК.**

**У праекце новай рэдакцыі Праграмы КПСС гаворыцца: «Сфера культуры заклікана задавальняць узрастаючыя запатрабаванні розных катэгорый насельніцтва, забяспечваць неабходныя магчымасці для самадзейнай мастацкай творчасці народа, развіваць здольнасці, узбагачаць сацыялістычны лад жыцця, фарміраваць здаровыя патрэбы і высокія эстэтычныя густы».**

СПАДЧЫНА

# АД АНТЫЧНАСЦІ ДА НАШЫХ ДЗЁН

У сваёй практычнай дзейнасці музей гісторыі БДУ імя У. І. Леніна імкнецца кіравацца гэтымі палажэннямі. Немалую ролю адыгравае музей у эстэтычным выхаванні студэнтаў і школьнікаў горада — асноўных яго наведвальнікаў. У час экскурсій яны знаёмяцца з гісторыяй культуры Старажытнага Егіпта, Індыі, Асірыі... Пасля завяршэння рэстаўрацыйных работ адкрылася новая экспазіцыя ў аддзеле антычнай культуры, дзе прадстаўлены злепкі скульптур старажытнагрэчаскіх аўтараў эпохі класіцызму і эліністму. У гэтых аддзелах акрамя экскурсій праводзяцца практычныя заняткі з будучымі гісторыкамі. Экспанаты музея неаднаразова выкарыстоўваліся пры падрыхтоўцы розных перадач Рэспубліканскага тэлебачання.

Вялікая ўвага ўдзяляецца прапагандзе гістарычнай і культурнай спадчыны нашай рэспублікі. Са старажытнай гісторыяй Беларусі і Мінска знаёміць экспазіцыя аддзела археалогіі, з помнікамі матэрыяльнай культуры беларускіх сялян XIX — пачатку XX стагоддзяў — аддзел этнаграфіі.

Летась з дапамогай гарадскога савета Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры на гістарычным факультэце была арганізавана выстаўка «Помнікі дойлідства Беларусі XII — XVIII стагоддзяў».

У 1984 годзе музею перададзена звыш ста графічных работ мастакоў рэспублікі М. І. Басалыгі, М. Купавы, Г. Паплаўскага, Г. Ціхановіча і інш. Цяпер выстаўка экспануецца на факультэце радыёфізікі і электронікі. Калекцыя мае не толькі мастацкую, эстэтычную, але і, у пэўнай ступені, гістарычную каштоўнасць. У ёй адлюстраваны гістарычныя, архітэктурныя і літаратурныя помнікі Беларусі, барацьба за ўстанаўленне Савецкай улады ў рэспубліцы, гады Вялікай Айчыннай вайны, сённяшні дзень навукі і культуры.

Сёлета ў рэспубліцы пройдуць мерапрыемствы, прысвечаныя 500-годдзю з дня нараджэння беларускага першадрукара, асветніка і культурнага дзеяча Ф. Скарыны. Да гэтай даты прыўрочана мастацкая выстаўка, на якой шырока прадстаўлены творы мастакоў-графікаў.

Вялікую дапамогу ў рабоце музею аказвае кіраўніцтва і метадычны аддзел Дзяржаўнага музея БССР.

**І. ДАВІДОВІЧ,**
загадчык музея гісторыі універсітэта.

УСЕСАЮЗНЫ КАМУНІСТЫЧНЫ

# ДОБРА РАЗАМ ПРАЦАВАЦЬ!

**15 лютага па ўсёй краіне прайшоў камуністычны суботнік у гонар XXVII з'езда КПСС. Падударнаму працавалі ў гэты дзень студэнты і супрацоўнікі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. У свяце камуністычнай працы прынялі ўдзел 7950 студэнтаў і 3120 супрацоўнікаў.**



Як прайшоў суботнік?

*Ірына Крэтовіч, сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта:*

— Філфак прыняў актыўны ўдзел у камуністычным суботніку. Мы працавалі на сваіх рабочых месцах — у вучэбным корпусе. Навялі парадак ва ўсіх студэнцкіх аўдыторыях, кабінетах, памяшканнях друкарні. Усе працавалі натхнёна.

Асабліва хачу адзначыць работу 1, 2 груп I курса і 4 групы III курса рускага аддзялення, 1,2 груп II курса і 2, 3 груп III курса беларускага аддзялення. Усім ім смела можна ставіць «выдатна» з плюсам. Прыклад у рабоце задавалі іменна гэтыя камсамольцы. А падрыхтаваў суботнік і добра арганізаваў фронт работ факультэцкі штаб працоўных спраў, які ўзначальвае студэнтка IV курса Святлана Спяновіч.

*Генадзь Губарэвіч, студэнт IV курса механіка-матэматычнага факультэта:*

— Яўка была стопрацэнтная. Настрой — выдатны. Выносілі смецце, бітую цэглу. Майстар



быў вельмі задаволены. Прызнаўся нам, што не чакаў такога энтузіязму. А я дык і не здзіўляюся: члены нашай брыгады маюць закалку студэнцкага будатрада.

Сваёй працай на камуністычным суботніку задаволены і Уладзімір Ганько, і Валера Мухамецьянаў, і Юра Віланскі. Усёй брыгадай вырашылі яшчэ сюды прыйсці. Ды што брыгадай, увесь свой СБА прывядуць!

*Ліда Цярэнцьева, начальнік штаба працоўных спраў мехмата:*

— Увесь факультэт стаў



удзельнікам суботніка. Ён праходзіў па некалькіх адрасах. Супрацоўнікі працавалі на сваіх рабочых месцах. Частка студэнтаў наводзіла парадак у вучэбных аўдыторыях, лабараторыях. Хлопцы працавалі ў студэнцкім кафэ. На кафедры ГА зрабілі ўборку і аформілі выстаўку дзяўчаты 2 групы IV курса. Хачу адзначыць, што там выдатна працавалі Іра Кулік, Галя Шкор, Марына Ляўковіч, Лена Ціхановіч. І яшчэ адзін адрас — наша падшэфная СШ № 170.

*В. Чудоўскі, старшыня прафбюро факультэта радыёфізікі і электронікі:*

— У суботніку прынялі ўдзел 234 супрацоўнікі і 512 студэнтаў факультэта. Праведзены мантажныя работы, абсталяваны клас навучаючых мікра-ЭВМ і дзве лабараторыі па тэарэтычных асновах радыётэхнікі, аформлены чатыры новыя стэнды нагляднай агітацыі, наведзены парадак у аўдыторыях і навуковых лабараторыях.

*Г. СВЯТЛЯК.*

*НА ЗДЫМКАХ: камсамольская арганізацыя супрацоўнікаў і выкладчыкаў кафедраў грамадскіх навук і гістфака працавала ў дзень «чырвонай» суботы ў студэнцкім кафэ «Гаудэамус»; у час суботніка ў камітэце камсамола ФПМ.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*

ЯНЫ ЗАСЛУЖЫЛІ ПРАВА ПАДПІСАЦЬ РАПАРТ КАМСАМОЛЬЦАЎ УНІВЕРСІТЭТА XXVII З'ЕЗДУ КПСС



# Алена Лебедзева:
# «САКРЭТ ПОСПЕХУ — ЗАХАПЛЕННЕ СПРАВАЙ»

*АЛЕНУ ЛЕБЕДЗЕВУ, студэнтку IV курса юрыдычнага факультэта называюць «гаспадыняй» студэнцкага клуба. І не выпадкова. Яна — аўтар шматлікіх сцэнарыяў факультэцкай агітбрыгады, студэнцкага тэатра мініяцюр, тэматычных вечароў. Дарэчы, агітбрыгада, якой кіруе Алена, лічыцца адной з лепшых ва універсітэце.*

*Выдатніца вучобы, член камітэта камсамола факультэта, яна, акрамя таго, яшчэ займаецца навуковай работай, піша вершы.*

*Калі пытаюць, як на ўсё хапае часу, А. Лебедзева адказвае адназначна: «Справа — у захапленні. Яшчэ хтосьці з вялікіх сцвярджаў: усе жанры добрыя, акрамя сумнага. А таму дзверы нашага клуба заўсёды адчынены для ўсіх, хто не мірыцца з сумам».*

*НА ЗДЫМКАХ: сярод лепшых студэнтаў свайго факультэта Алена Лебедзева заслужыла права падпісаць рапарт камсамольцаў універсітэта XXVII з'езду КПСС; адзін дзень Алены.*

*Тэкст і фота*
*А. ВАЛОШЫНА.*





# Свята Вольгі

**Сярод акадэмсектараў універсітэта ў 1985 годзе першае месца заняў акадэмічны сектар філалагічнага факультэта, які ўзначальвае Вольга Фелькіна.**

СВЕТЛЫЯ завіткі валасоў, прыемная ўсмешка. Гэта Оля. У дзяўчыны рана праявілася любоў да кніг. Жартуе:

— Можа таму, што ў тры з паловай гады навучылася чытаць, а ў шэсць ужо была запісана ў бібліятэку.

Можа і так. А можа і таму, што ў яе жыцці была Ніна Лявонцьеўна Цімафеева. Дзяўчына добра памятае, якой строгай і справядлівай была настаўніца. З ёй было цікава, бо матэрыял выкладала Ніна Лявонцьеўна не толькі са школьных падручнікаў.

Іменна яна, настаўніца, калі Оля выбірала шлях у прафесію, параіла вывучаць філалогію.

— Калі па-праўдзе, я баялася дзяцей,— кажа Вольга.— А дакладней — думкі, што не зацікаўлю, не змагу быць для іх такой, якой была для нас Ніна Лявонцьеўна.

Мінулай восенню такія сумненні развеяліся. Практыка ў 71-й школе Мінска, за якую студэнтка атрымала «выдатна», дала ёй добрую магчымасць праверыць свой выбар. І цяпер Оля з радасцю гаворыць пра «шчасце быць настаўнікам».

— Я добра памятаю першую лекцыю. У вялікай аўдыторыі яе чытаў Адам Яўгенавіч Супрун. Ужо тады ён спадабаўся як выкладчык і чалавек. Пры выбары спецыялізацыі я выбрала кафедру агульнага і славянскага мовазнаўства, пад яго кіраўніцтвам пішу курсавую,— расказвае Вольга.

Пашанцавала дзяўчыне: яна сустрэла яшчэ аднаго настаўніка. Ён дапаможа ёй не згубіцца ў студэнцкім моры клопатаў, інтарэсаў.

Дарэчы, наконт інтарэсаў. Для Вольгі цікавым з'яўляецца не толькі філалогія. Яна любіць тэатр, з захапленнем гаворыць пра яго, любіць кіно.

Як жа паспявае Вольга? Сакрэту, як лічыць дзяўчына, няма.

— Проста люблю вучобу і сваё студэнцкае жыццё імкнуся напоўніць багаццем навакольнага свету.

Не проста і не адразу прыйшлі перамогі да Вольгі Фелькінай, намесніка сакратара камітэта камсамола філфака па акадэмічнай рабоце. Другі год выконвае камсамолка гэтае даручэнне. Радуецца поспехам таварышаў. У апошні час адказней да сваіх абавязкаў сталі адносіцца і члены вучэбна-выхаваўчай камісіі. Самыя цесныя сувязі ў акадэмсектара з «Камсамольскім пражэктарам». Оля смяецца:

— Як жа інакш, калі з яго старшынёй у адным пакоі жывём.

Хвалюючых момантаў у студэнткі Вольгі Фелькінай было шмат. І на першым курсе, і цяпер — на чацвёртым. Вось, напрыклад, паездка ў верасні мінулага года на вытворча-азнаямленчую практыку ў Йенскі універсітэт у ГДР. Філфакаўцы пазнаёміліся з вучобай сваіх нямецкіх равеснікаў, з іх краінай.

— Уражанняў так шмат, што і не раскажаш усе адразу. Ды толькі з-за Дрэздэнскай галерэі паехаць варта!

Зусім нядаўна быў у Вольгі святочны дзень. Яна заваявала права падпісаць рапарт камсамольскага калектыву універсітэта XXVII з'езду КПСС. Хвалюючы быў момант, калі Вольга з сябрамі стала каля сцяга, каб сфатаграфавацца. Бадай, іменна ў такія моманты ўспамінаецца самае добрае. Што ж успомніла дзяўчына?

— Перамогу нашага акадэмсектара.

І гэта заканамерна, бо ў перамозе акадэмічнага сектара філалагічнага факультэта ёсць і яе заслуга. Гэта перамога і студэнткі IV курса, стыпендыяткі імя Я. Коласа Вольгі Фелькінай.

С. ГОГАЛЬ,
наш кар.

ПРАБЛЕМА ПАТРАБУЕ ВЫРАШЭННЯ!

# ПАЛАЦ — ПА КАТЭГОРЫІ, КАТУХ — ПА ПЛОШЧЫ...

МАЛАДОСЦЬ І ТВОРЧАСЦЬ заўсёды ідуць побач. Цэнтр культурна-масавай работы ва універсітэце — студэнцкі клуб, які зарэкамендаваў сабе працаздольным калектывам.

Хто ў горадзе ды і ў рэспубліцы не ведае калектывы народнага ансамбля танца «Крыжачок», народнага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля «Неруш», народнага тэатра, агітбрыгады, народнага хору народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў! А нашых салістаў Алега Атаманава, Вольгі Клядовіч, Святланы Пухаўскай, Уладзіміра Максімкова, Сяргея Глеба!

Праўленне студэнцкага клуба, мастацкі савет універсітэта заўсёды аказваюць метадычную дапамогу факультэтам і інтэрнатам у правядзенні і арганізацыі вечароў і свят. У полі зроку клуба знаходзяцца і традыцыйныя «Дні факультэтаў», якія праходзяць па спецыяльных сцэнарыях як тэатралізаваныя паказы.

Асабліва гарачы час у клубе наступае ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення традыцыйнага фестывалю «Студэнцкая вясна» і агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці замежных студэнтаў, якія прыцягваюць шырокія аўдыторыі студэнцтва (штогод больш як 3 тысячы чалавек) да творчасці, выяўляюць новыя таленты, садзейнічаюць росту радоў мастацкай самадзейнасці універсітэта.

Нашы калектывы не толькі выязджаюць са сваімі праграмамі па саюзных рэспубліках і за мяжу, але і прымаюць у сябе калектывы, з якімі падтрымліваюць цесныя сяброўскія сувязі. Сярод іх — калектывы Адэскага дзяржаўнага універсітэта імя І. Мечнікава, Латвійскага дзяржаўнага універсітэта імя П. Стучкі, Львоўскага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, сябры з ГДР, Балгарыі... Часта ў студэнцкім клубе можна ўбачыць кіраўнікоў гэтых калектываў, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый.

Наогул, студэнцкі клуб — гэта месца сустрэч студэнтаў з артыстамі і драматургамі, пісьменнікамі і кампазітарамі, аўтарамі і выканаўцамі песень. Па запрашэнню клуба ва універсітэце гасцямі былі І. Лучанок, А. Адамовіч, А. Дольскі і В. Доліна, Т. і С. Нікіціны, В. Саломін, А. Камароў, Б. Хмяльніцкі і іншыя ўсім нам вядомыя людзі.

Студэнцкі клуб — гэта і свайго роду музей мастацкай самадзейнасці універсітэта, дзе сабраны ўсе прызы, сувеніры, атрыманыя калектывамі і выканаўцамі за іх упартую працу, якая прыносіць людзям радасць.

І вельмі шкада, што клуб БДУ імя У. І. Леніна, які прыраўноўваецца па сваёй катэгорыі да палацаў культуры і мае пад сваім кіраўніцтвам такую колькасць народных калектываў, туліцца ўсяго на... 12 квадратных метрах. Мы не маем добра абсталяванай сцэны, пастаянных памяшканняў для рэпетыцый. Да гэтага часу так і не вырашана пытанне з памяшканнем актавай залы інстытута народнай гаспадаркі, якое арэндуе БДУ. Няма якасных музычных інструментаў. Ды і інтэр'ер клуба не на ўзроўні.

Гэтыя праблемы патрабуюць тэрміновага рашэння. Абыякавыя адносіны да гэтых пытанняў могуць прывесці да зніжэння якаснага і колькаснага ўзроўню ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці.

М. ТАРАСАВА.
мастацкі кіраўнік
студэнцкага клуба.

АРЫЕНЦІР

# КНІГААБМЕН

КНІГААБМЕН — новая прагрэсіўная форма гандлю, якая стала вельмі папулярнай сярод пакупнікоў. У працэсе кнігаабмену пашыраецца асартымент друкаваных выданняў магазінаў і папаўняюцца букіністычнай літаратурай павялічанага попыту асабістыя бібліятэкі.

Вузкаспецыяльная літаратура прымаецца на мэтавы абмен (арганізаваны абмен паміж прыватнымі асобамі). Для мэтавага абмену не абавязкова здаваць кнігу ў магазін, дастаткова указаць у спецыяльным журнале прапануемую і жадаемую ўзамен. Мэтавы кнігаабмен ажыццяўляецца на працягу 60 дзён. Калі абмен не адбыўся, заказ здымаецца.

У асноўным на кнігаабмен прымаюцца выданні, якія карыстаюцца павышаным попытам. Эквівалентнасць абмену вызначаецца з улікам тыражу выдання, яго арыгінальнасці, узроўню попыту ў магазіне. Кнігаабмен не ажыццяўляецца, калі прапануемая кніга не належыць куплі згодна з існуючай інструкцыяй або ёсць у дастатковай колькасці ў магазінах горада. Калі вашу кнігу не ўзялі на кнігаабмен, вы маеце магчымасць здаць яе ў букіністычны аддзел.

Пазнаёміцца з аддзелам кнігаабмену, здаць літаратуру вы зможаце ў магазіне «Навукова-тэхнічная кніга», які знаходзіцца па Ленінскаму праспекту, 48 (станцыя метро «Плошча Якуба Коласа»). Нашы тэлефоны: 33-44-32, 33-48-58.

Г. ХІТРЫК.
таваразнаўца па рэкламе
магазіна «НТК».

Завершаны зімовы этап традыцыйнай спартакіяды вышэйшых навучальных устаноў БССР. Зараз у табліцы вынікаў спартсмены Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна займаюць пятае месца, яны набралі 296 ачкоў. Але неабходна ўдакладніць, што нашы юнакі і дзяўчаты выступілі не ва ўсіх відах. Таму, можна сказаць, у «запасе» яны маюць магчымасць дагнаць асноўных канкурэнтаў: студэнтаў інстытутаў народнай гаспадаркі і радыётэхнічнага, каб заняць вышэйшае месца. Да таго ж, яшчэ ёсць час для карэкціроўкі вучэбна-трэніровачнага працэсу.

## РЭСПУБЛІКАНСКАЯ СПАРТАКІЯДА

# АД ПОЛЮСА ДА ПОЛЮСА

НАЙБОЛЬШАГА поспеху дамагліся нашы шахматысты і цяжкаатлеты. Ёсць нешта агульнае, відаць, звязанае з увагай спартыўнага кіраўніцтва універсітэта да кожнага віду спорту, у гэтых двух поспехах. Вось так — ад шахмат і да цяжкай атлетыкі, калі правільна будзе назваць іх «палярнымі» відамі — ад полюса да полюса ідзе нялёгкая творчая работа ў галіне спорту універсітэта.

Упрыгожаннем любых спаборніцтваў, ці то Алімпійскіх гульняў, ці студэнцкіх спартакіяд — з'яўляюцца выступленні штангістаў. Глыбока памыляюцца тыя, хто лічыць цяжкую атлетыку грубай, непрыгожай, дзе ёсць толькі намаганне спартсмена і звон непакорнага снарада. Цяжкая атлетыка з кожным днём заваёўвае сэрцы новых і новых прыхільнікаў усіх узростаў. Гэта напружаная барацьба чалавека-волата над вялізнымі кілаграмамі металу, гэта — барацьба са сваімі слабасцямі, гэта — упарты паядынак з сапернікамі, якія моўчкі сочаць за тваім падыходам да штангі. У цяжкай атлетыцы сканцэнтраваліся сілы чалавека, яго магчымасці пакарэння фантастычных рэкордаў.

Напружанай, драматычнай была барацьба штангістаў у праграме спартакіяды ВНУ рэспублікі. Упэўнена выступілі майстры спорту СССР І. Зданоўскіс (геафак, ПА), Ю. Карсецян (гістфак, ПА), І. Казлоў (гістфак, І курс), В. Шаўчук (юрфак, III курс), П. Бурдыка (юрфак, II курс). У выніку яны разам з таварышамі прынеслі сорак ачкоў за першае агульнакаманднае месца, у чым вялікая заслуга старшага выкладчыка В. Ф. Кавалёва.

Цяпер перанясём свой погляд з утульнай спартыўнай залы на рыпучую марозную лыжню, на якой ішла цікавая барацьба лепшых студэнтаў-лыжнікаў рэспублікі. Вось калі па-сапраўднаму разумееш сэнс выразу: «плавілася лыжня». Так, ішлі гарачыя, азартныя спаборніцтвы. Здавалася, не толькі лыжня, але і лютаўскае паветра стала гарачым ад напружання майстэрства, волі, характараў лыжнікаў універсітэта. Лепшыя вынікі паказалі А. Данільчанка (журфак, IV курс), А. Чэпік (гістфак, III курс), А. Моніч (юрфак, І курс). Ды і астатнія імкнуліся не адставаць ад сваіх таварышаў па камандзе. Вынік — IV месца, але яно каштуе не менш, чым прызавое. У тым сэнсе, што гэта — першы значны поспех лыжнікаў БДУ імя У. І. Леніна. Самаадданая праца трэнера-выкладчыка Людмілы Капыловай і яе выхаванцаў павінна была прынесці важкія рэзультаты. Добра, што ніякая выпадковасць не перашкодзіла ўдаламу выступленню лыжнікаў. Ды і недарэчныя дробязі не існуюць у моцным згуртаваным калектыве лыжнай зборнай.

А на барцоўскім дыване трыццацігадовы (вось так узрост адступае перад трэніраваным чалавекам) загадчык лабараторыі кафедры фізікі цвёрдага цела. У. Панарадаў бліскуча дабіўся трох «чыстых» перамог. Прынеслі максімальныя ачкі заслужаны майстар спорту К. Маджыдаў (юрфак, III курс), В. Гуль (ФПМ, IV курс), А. Яцукевіч (хімфак, І курс) і іншыя. У сваёй падгрупе зборная барцоў-класікаў уступіла першы радок у табліцы толькі інстытуту фізкультуры.

Столькі ж ачкоў (32) прынеслі ў скарбонку зборнай універсітэта стралкі. Трапна стралялі А. Маслоўская (хімфак, І курс), П. Хрыпач (юрфак, І курс), В. Іваноў (факультэт радыёфізікі і электронікі, V курс).

Не зусім так, як хацелася б, выступілі лёгкаатлеты і плыўцы. Тут ёсць шэраг аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын. Захварэла перад спаборніцтвамі Д. Шкор (ФПМ, II курс), на якую ўскладалася вялікая надзея. У апошні час з нейкай прахaлодай да трэніровак і спаборніцтваў ставіцца майстар спорту па лёгкай атлетыцы С. Якубава (юрфак, III курс). Цікава, ці не было сорамна спартсменцы перад сабой, перад трэнерамі, перад сваімі сябрамі за 12-е месца, якое яна заняла?

Да апошняга дня турніра працягвалася вострая спрэчка дзюдаістаў універсітэта і політэхнічнага інстытута. У выніку наша каманда заняла II месца. Асабліва трэба адзначыць выступленне А. Ламакіна (юрфак, II курс), які здаў сесію на «выдатна» і стаў пераможцам у катэгорыі да 78 кг. Гэта яшчэ адзін прыклад таго, што можна на «выдатна» здаваць экзамены і ў вучобе, і ў спорце.

Зборная шахматыстаў упершыню выступала ў студэнцкім саставе. Вельмі ўдала гуляў Л. Смелы (фізфак, V курс), які прадэманстраваў майстэрства, умелае размеркаванне часу, разуменне пазіцыі ў фінальнай сустрэчы. Таксама выдатна правялі свае матчы Э. Калеснік (фізфак, III курс), А. Галубовіч (ФПМ, III курс), Ю. Гельфанд (мехмат, IV курс). Каманда мае нявыкарыстаныя патэнцыяльныя магчымасці, бо не ў лепшай форме былі мацнейшыя шахматысты — члены маладзёжнай зборнай БССР В. Атлас і В. Ламакіна.

Застаецца толькі назваць тых, на каго не праліваецца святочнае святло юпітэраў у будзённай працы — трэнераў нашага універсітэта, чыё майстэрства, вопыт, педагагічная мудрасць спрыялі добрым вынікам спартсменаў. Вось яны: В. А. Рудзянкоў (класічная барацьба), В. М. Новік (кулявая стральба), М. А. Брыткоў (дзюдо), В. М. Рэйзін (шахматы).

— Чым былі адметнымі спаборніцтвы спартакіяды ВНУ рэспублікі?— з такім пытаннем я звярнуўся да старшыні спартыўнага клуба А. С. Балдзіна.

**— У 1985 годзе ў рэспубліцы было створана адзінае добраахвотнае фізкультурна-спартыўнае таварыства прафсаюзаў БССР замест «Спартака», «Буравесніка», «Чырвонага сцяга». У сувязі з гэтым быў зменены парадак правядзення круглагадовай спартакіяды спартклубаў ВНУ БССР у 1986 годзе.**

**Па-першае, цяпер яна праводзіцца ў чатыры этапы. Першы этап — спаборніцтвы ў вучэбных групах, другі этап — масавыя турніры сярод вучэбных груп факультэтаў, трэці — першынство Мінскага аблсавета ДФСТ прафсаюзаў сярод вучэбных груп і факультэтаў. І завяршаюць Рэспубліканскую спартакіяду спаборніцтвы сярод зборных каманд вышэйшых навучальных устаноў.**

**Па-другое. Калі раней фінальныя старты працягваліся поўны год у розных гарадах рэспублікі, то зараз — у два этапы: зімні і летні. Такім чынам, дзяржаўныя сродкі не будуць раскідвацца на шматлікія пераезды-раз'езды студэнтаў.**

**Па-трэцяе. Зараз дапускаюцца да спаборніцтваў тыя, хто мае ўзровень падрыхтоўкі не ніжэй, чым першы разрад. А старэйшыя за 23 гады павінны быць майстрамі спорту СССР.**

**ВНУ нашай групы прымаюць удзел у 17 відах спорту з 32. Як вы разумееце, перад намі былі цяжкасці ў выбары гэтых відаў. Пры самым падрабязным аналізе і прагназіраванні спорт застаецца спортам. І ніхто не застрахаваны ад выпадковасцей, зрываў. Вынік жа кожны спартсмен павінен паказаць не ніжэй нарматыву допуску. Гэта даволі высокія патрабаванні, таму цяпер перамагаць будзе якасць выступленняў, а не колькасць удзельнікаў у камандзе.**

**Ёсць прынцыповая адметнасць спартакіяды-86 у сістэме вызначэння агульнакаманднага першынства. Раней было так, што, напрыклад, барцы класічнага стылю атрымоўвалі за І месца 286 ачкоў, а плыўцы — больш як 3000. Па новай сістэме ўсе віды ацэньваюцца аднолькава: першае месца — 40 ачкоў, другое — 36 і г. д. Як бачыце, насычанасць вялікая, і любая няўдача нясе страты камандзе.**

Такім чынам, нашым спартсменам засталося прыняць удзел у спаборніцтвах па баскетболу, валейболу, веласпорту, мастацкай гімнастыцы, арыентаванню, летняму плаванню і лёгкай атлетыцы, якія пройдуць з 1 па 10 ліпеня ў г. Гродна. Будзем спадзявацца на выдатнае выступленне універсітэцкай зборнай у спаборніцтвах летняга этапа спартакіяды вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі.

А. СЦЯПАНАЎ,
наш кар.

**Вынікі зімовага этапа рэспубліканскай спартакіяды спартыўных клубаў ВНУ: 1. БДІФК — 410 ачкоў; 2. БПІ — 353,5; 3. БДІНГ — 343,5; 4. МРТІ — 314; 5. БДУ — 296; 6. БТІ — 260.**

## ТЫДЗЕНЬ ЛЫЖНАГА СПОРТУ

# ЛЫЖНЯ ЧАКАЕ!



***ТЫДЗЕНЬ ЛЫЖНАГА СПОРТУ** ва універсітэце пачаўся 15 лютага. Зараз усталявалася цудоўнае для лыжных спаборніцтваў (ці проста прагулак) надвор'е. Прырода нібыта гаворыць чалавеку: «Ты стаў такім велічным таму, што спаборнічаў з часам, з самім сабой. Я раблю, што магу — іскрысты снег, невялікі марозец, цёплае ласкавае сонейка. Справа за табой!»*

## ТЫСЯЧА І АДЗІН РЭЦЭПТ ТВАЙГО АДПАЧЫНКУ

# ДУША ПАД КУПАЛАМ

**ЦЫРК. Тут не патрэбны доўгія каментарыі і філасофскія разважанні. Гэта само па сабе ёмістае і мудрае паняцце.**




**Цырк. Тут мы маладзеем, і наша душа, быццам птушка, накіроўваецца ўвысь. Мы лунаем, мы аказваемся ў рэальнай казцы, і здаецца, што няма грані паміж ёю і нашым жыццём, бо гэта ж так праўдзіва.**

**Цырк. Мы марым аб такой жа прыгажосці, якую бачым пад купалам, аб пакоранай складанасці, аб утаймаванай сіле прыцягнення. І кожнае сэрца, якое даўно ў дзяцінстве парыўна білася ў цырку, здрыганецца зноў пры відзе манежа.**

**Зараз у абноўленым будынку Мінскага дзяржаўнага цырка выступае славуты украінскі калектыў пад кіраўніцтвам народнага артыста УССР Уладзіміра Шаўчэнкі.**

**У цыркавым мастацтве трывала перапляліся тэатр, музыка, спорт. Цырк — дэмакратычны, карыстаецца ўсенароднай любоўю ў нашай краіне, вялікай папулярнасцю ва ўсім свеце за шчырасць, аптымізм.**

**Яшчэ з даўніх часоў ён быў непарыўна звязаны са спортам, на манежах праходзілі схваткі барцоў, абнаўляліся рэкорды па падняццю цяжкасцей. З гадамі цырк змяніўся, стаў больш складаным. Яшчэ больш бачным стала яго непарыўная сувязь са спортам, мужнасцю, сілай.**

**Унікальны нумар «Гімнасты на турніках» пад кіраўніцтвам Ігара Бесараба. Гэта прыгажосць у дынаміцы, іскраметная цыркавая гімнастыка ў трох квадратах турнікоў — такое не мае аналагаў у сусветным мастацтве. Акрамя Таццяны і Ігара Бесарабаў, Георгія Сенічкіна, Шаміля Айнетдзінава ў нумары ўдзельнічаюць майстар спорту міжнароднага класа па гімнастыцы Анатоль Сайфулін, майстры спорту СССР Аляксандр Агафонаў, Віктар Каналюк, Генадзь Паліпаў, Васіль Столяраў.**

**Як і на спартыўных спаборніцтвах, глядач бачыць «чыстае» выступленне гімнастаў, а за кулісамі — напружаная праца, штодзённыя рэпетыцыі, няспынны творчы пошук больш складанага, вытанчанага. Бывае ўсе: і няўдачы, і засмучэнні, але да спектакля будзе поўны парадак. І пасля галавакружнай фігуры артысты грацыёзна саскокнуць на манеж і ўсміхнуцца вам.**

**Любы нумар з праграмы украінскага калектыву — цудоўны. І кожны патрабуе самааддачы, спрытнасці, смеласці, бездакорнага валодання целам, сталёвых мускулаў і мяккага сэрца.**

**С. АЛЕГАЎ.**

## АМАЛЬ СУР'ЁЗНА

# На футболе

*СВІСТОК. Гульня пачалася. Сёння мой дэбют.*

*Я моцна хвалююся. Намаганнем волі падаўляю здрадніцкую слабінку ў каленях. Раблю некалькі рыўкоў. Адчуваю, як разаграваюцца мышцы. Мяч ляціць дакладна на мяне, я спрытна адкідваю яго на вуглавы і хутка займаю пазіцыю, вымушаны кагосьці адпіхнуць.*

*Рэзаная падача, абаронца выбівае мяч у цэнтр. Хуткая контратака, я не адстаю. Імкліва бягу па краі поля, ненаўмысна збіваю бакавога суддзю. Пакуль мяч перадаецца, я ўжо каля самай штрафной.*

*Тут закручваецца сапраўдная карусель. Мяч адскоквае і моцным ударам накіроўваецца ў дальні вугал варот. Абаронца ў прыгожым «шпагаце» не дацягваецца да мяча. Самаахвярны кідок галкіпера ўжо не выратоўвае ад гола. Стадыён замёр. Падаю я. Вытрымка ў мяне тая, што патрэбна. Я бачу ў відашукальнік майго «Зеніта», як мяч вось-вось затрапечацца ў сетцы. Націскаю спуск. Гатова! 1:0.*

*Толькі цяпер заўважаю, як шалёна калоціцца сэрца і льецца пот. Ну вось, а гавораць, што фотажурналістам не патрэбна спартыўная загартоўка...*

***А. ЧАРНЯЎСКІ.***


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

20 лютага 1986 г.
Зак. 99. АТ 07099.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.